# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»



*ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно» № 16 (лістапад)*

## «ЗУБРЯТСКИЙ КОРПУНКТ»

***З 17 кастрычніка па 6 лістапада 2014 года на базе НДЦ “Зубраня” прайшла змена “Зубрятский корпункт”. Яе ўдзельнікамі сталі фіналісты фестывалю-конкурсу дзіцячых сродкаў масавай інфармацыі “Свежы вецер”, сярод якіх былі члены рэдакцыйнай калегіі нашай газеты: Ксенія ГУРЭНЧЫК (9 “Б”) і Алена ЦЭНКЕЛЬ (9 “Б”).***




***– Мне вельмі спадабалася ў НДЦ “Зубраня”, - гаворыць К. Гурэнчык, - бо ад паездкі я атрымала масу пазітыўных эмоцый і прыемных успамінаў. Калі вы хочаце пазнаёміцца з новымі людзьмі, весела правесці час, а таксама паглыбіць свае веды ў галіне журналістыкі, абавязкова наведайце “Зубраня”.***

Юных журналістаў размясцілі ў двух карпусах, Блакітным востраве і Лясным доме, дзе ім дапамагалі пяцікурснікі інстытута журналістыкі БДУ. У кожным корпусе было па дзве рэдакцыі, малодшая і старэйшая. Рэдакцыі змагаліся за “Залатое пяро” - пераходную ўзнагароду, якая ўручалася лепшаму корпусу. За час змены было арганізавана мноства розных мерапрыемстваў, такіх, як важацкі вечар, міс-Зубраня, майстар-класы, сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ, конкурсы на лепшае журналісцкае расследаванне, лепшую дзіцячую старонку, лепшую рэкламу фестывалю, турніры прамоўцаў і іншыя творчыя спаборніцтвы.

**По выніках змены наша выданне “ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА” было адзначана дыпломам у намінацыі “Лепшае інтэрв’ю”.**

# ТВОЙ РОЗУМ - ТВОЙ ГОНАР

**Вікторыя МІКЛУШ (11 "Б") -
1 месца па гісторыі
Дзіяна ХАМЕТШЫНА (11 «Б») -
1 месца па грамадазнаўстве
Ягор ШПАКОЎСКІ (10 "А") -
1 месца па матэматыцы і фізіцы
Дзіяна ПАДДУБСКАЯ (10 «А») -
1 месца па рускай мове
Кацярына РОГАВА (10 «А») -
1 месца па абслугоўваючай працы
Яфім КАПЛІЙ (10 «А») -
1 месца па біялогіі
Ірына ЕРАМІН (9 "Б") -
1 месца па рускай мове
Макар ШПАКОЎСКІ (9 "Б") -
1 месца па фізіцы
Дзмітрый ДАРОЖКА (9 «В») -
1 месца па геаграфіі
Дзмітрый КЛЯШЧОНАК (8 "Б") -
1 месца па тэхнічнай працы**

***Сёння мы гутарым з тымі вучнямі, якія дастойна абаранілі гонар нашай навучальнай установы на другім этапе Рэспубліканскай прадметнай алімпіяды і сваім розумам дасягнулі алімпійскай вяршыні. В順шуем пераможцаў!***

**Матэрыял падрыхтавала
Алена ЦЭНКЕЛЬ.**



**ІРЫНА ЕРАМІН:**

- Складана адназначна сказаць, чым захапляе мяне руская мова. Прадмет мне лёгка даецца, я яго проста разумею. Я жадаю дасканала авалодаць рускай і яшчэ некалькімі іншымі мовамі. Планую звязаць сваё жыццё з рускай мовай.

Калі гаварыць пра падрыхтоўку да алімпіяды, то было цяжка: кожны дзень займалася рускай мовай. Нягледзячы на гэта, я вельмі хвалявалася, калі ішла на алімпіяду. За час падрыхтоўкі я даведалася многа цікавай і новай інфармацыі.

Я лічу, што ведаць рускую мову – гэта быць адукаваным чалавекам, які здольны прыгожа перадаваць свае думкі.

Акрамя рускай мовы, мне падабаюцца хімія і англійская мова. Апошні з прадметаў дазваляе разумець людзей з іншых краін свету. Але, на маю думку, усе прадметы цікавыя і патрэбныя



**КАЦЯРЫНА РОГАВА:**

- Я пачала займацца працоўным навучаннем таму, што вырабляць нешта сваімі рукамі - гэта лепшае, што можа стварыць чалавек. Для мяне праца - гэта хобі, звязваць сваё жыццё з ёй я не планую.

Калі я рыхтавалася да алімпіяды, то адкрыла для сябе шмат цікавага, што дапаможа ў жыцці. Было цяжка, але я вырашыла перамагчы і дамаглася жаданага выніку.

Акрамя ўрокаў працы, мне падабаюцца і ўсе іншыя прадметы, кожны па-свойму вабіць да сябе.

**(Працяг на стар. 5)**




## ВЫБРАЎШЫ Ў СЯБРЫ ЦЫГАРЭТУ, ТЫ СТРАЦІШ:

- Грошы, якія ёсць у цябе.
- Рэальныя поспехі ў вучобе і спорце.
- Магчымасць атрымаць у будучыні перспектыўную працу.
- Сваё ўласнае здароўе.

## А НАБУДЗЕШ:

- Кампанію па курэнні.
- Імідж стандарту, такога, як усе.
- Прапаленае адзенне.
- Жоўты колер скуры.
- Раздражненне пры немагчымасці запаліць.
- Кашаль раніцамі.
- Аддышку пасля фізічнай нагрузкі.
- Ранняе старэнне скуры.

**РЭАЛЬНА ЎЗВАЖ УСЕ ПЛЮСЫ І МІНУСЫ ТАКОЙ "СЯБРОЎКІ", ЯК ЦЫГАРЭТА, І ЗРАБІ СВОЙ ВЫБАР. ВЕДАЙ, ШТО ВЫТВОРЦЫ ЦЫГАРЭТ МАНІПУЛЮЮЦЬ ТАБОЙ, ЗАРАБЛЯЮЧЫ ГРОШЫ НА ТВАІМ ЗДАРОЎІ.**



А что поможет тебе, как думаешь?

*Ты бачыш перад сабой рэкламу цыгарэт. Пра што яна табе кажа? Магчыма, яна вабіць цябе ў фантастычны і неспазнаны свет, пропускам у які з'яўляецца цыгарэта? Падумай! Па добрай волі пачынаеш рабіць тое, што прывядзе, у лепшым выпадку, да пагаршэння здароўя, а ў горшым - заб'е. Курэнне не з'яўляецца фізіялагічнай патрэбай чалавека. Гэта толькі звычка, якая шкодзіць тваймy здароўю. Звычка паліць - гэта вораг, які можа па-майстэрску прыкідвацца сябрам. Сёння ён дапамагае табе падтрымаць гутарку, зняць нервовае напружанне, зацьміць адзіноту, стварыць імідж сучаснага чалавека, а заўтра з'явяцца наступствы гэтай дапамогі. Вырашы - ці патрэбна табе ў памочнікі цыгарэта? Што можа быць горш за двудушнага сябра? Сяброў ты выбіраеш сам.*




**БУДЗЬ самім сабой! Не спрабуй пераймаць кагосьці ў чымсьці, асабліва калі гэта тычыцца шкодных звычак. Знайдзі свой уласны стыль ва ўменні апранацца і трымаць сябе. Шукай сяброў, якім ты можаш давяраць. Паважай дарослых людзей, бацькоў і сваіх аднагодкаў. СТАНЬ сам для іншых прыкладам у паводзінах. Хай твая індывідуальнасць працуе на цябе. Уменне прымаць абдуманыя рашэнні - адна з вартасцей дарослага самастойнага чалавека.**

## БЫЦЬ НЕЗАЛЕЖНЫМ АД ТЫТУНЮ – ГЭТА

1. Заўсёды быць у добрай спартыўнай форме.
2. Быць самастойным чалавекам.
3. Захаваць сваё здароўе.
4. Сфарміравацца як асоба.
5. Выглядаць молада і прывабна.
6. Стварыць сям'ю і выгадаваць здаровых дзяцей.

# Я НЕ ПАЛЮ, ТАМУ ШТО...

*Нікацін і іншыя рэчы, якія знаходзяцца ў адной цыгарэце, пранікаюць у арганізм чалавека і імгненна атручваюць яго. Дзяўчыны, якія пачалі паліць, выглядаюць старэйшымі за свой узрост, маюць непрыгожы колер скуры, жоўтыя зубы і дрэнны пах з роту. Асабіста я ніколі не буду паліць, бо дадзеная звычка шкодзіць арганізму чалавека. Усё ў нашых руках, адмоўся і ты ад цыгарэт!*
**(Кацярына САХОНЧЫК, 8 "Б")**

*Курэнне зацягвае цябе, і ты не можаш спыніцца. Гэта шкодзіць здароўю! Па гэтай прычыне я не палю.*
**(Вікторыя БЕЛАЯ, 9 "Б")**

*Я не магу растлумачыць прычыну. Для мяне гэта - прынцып! І гэта мне падабаецца.*
**(Данііл КРЫЖБЕРСКІ, 9 "Б")**

*Я не палю таму, што хачу, каб у мяне была прыгожая ўсмешка, не было спецыфічнага паху. А яшчэ я хачу мець прыгожы, а не хрыплы голас. Дзяўчына павінна вылучацца жаноцкасцю.*
**(Ксенія ГУРЭНЧЫК, 9 "Б")**

*Я спартсмен! І я павінен заўсёды быць моцным і здаровым!*
**(Сяргей ФЕДАРЫНЧЫК, 10 "Б")**

*Я лічу, што курэнне - занятак слабых, дурная справа. Здавацца перад сябрамі крутым з дапамогай цыгарэт - гэта не маё. Я здароўе шаную!*
**(Марыя МІКУЛЬЧЫК, 11 "Б")**

*Не палю таму, што гэта шкодна. Нікацін згубна ўплывае на здароўе, а дакладна на лёгкія. Я хачу быць здаровым, а не залежным ад, скажам, наркотыкаў у выглядзе цыгарэт, і не хачу загубіць сваё жыццё.*
**(Максім ВАСІЛЕНЯ, 10 "А")**

*Таму, што звычка паліць - гэта залежнасць, ад якой цяжка адвыкнуць. Па-другое, пагаршаецца здароўе, асабліва ў дзяўчат, будучых матуль.*
**(Крысціна ПІРОЖНІК, 10 "А")**

**Матэрыял падрыхтавала Юлія ПІСКУН.**

# ТВОЙ РОЗУМ - ТВОЙ ГОНАР

**(Працяг. Пачатак на стар. 2)**



**ВІКТОРЫЯ МІКЛУШ:**

- Я пачала вывучаць гісторыю з-за таго, што мяне гэтым прадметам зацікавіў сябар. Ён расказваў мне пра розныя сусветныя падзеі, якія адбываліся ў гісторыі. І ў мяне з'явілася цікаўнасць да гэтага прадмета. Летась я прымала ўдзел у першым этапе Рэспубліканскай прадметнай алімпіяды. А сёлета спрабавала свае сілы на раённым узроўні.

Падчас падрыхтоўкі самым складаным было засваенне патрэбнай інфармацыі, якая здзіўляла сваімі аб'ёмамі: даты, паняцці, лагічныя ланцужкі, з дапамогай якіх можна арыентавацца ў гісторыі. Вельмі многае трэба было прачытаць. Яшчэ цяжкасць заключалася ў тым, што да дзясятага класа я ніколі не ўдзельнічала ў алімпіядах.

Акрамя гісторыі, мне падабаюцца руская і беларуская літаратуры, біялогія.



**ДЗІЯНА ПАДДУБСКАЯ:**

- Канкрэтна адказаць, што выклікае цікавасць да рускай мовы, я не магу, мне проста падабаецца гэты прадмет. У далейшым я планую звязаць жыццё з мовамі, і магчыма, не толькі з рускай.

Падрыхтоўка да алімпіяды праходзіла цяжкавата, таму што давялося амаль месяц кожны дзень займацца рускай мовай. Канікул нават не адчула, бо з раніцы ў школу на заняткі. Пасля ўрокаў таксама праходзіла падрыхтоўка да алімпіяды. Стамлялася вельмі. У самой алімпіядзе, напэўна, самым складаным быў водгук. Першую гадзіну думак не было ўвогуле, але потым распісалася так, што не хапіла нават часу перапісаць у чыставік. Падчас падрыхтоўкі я даведалася шмат новых слоў, фразеалагізмаў, бліжэй пазнаёмілася з дзяўчатамі, з якімі хадзіла на алімпіяду. Пасля перамогі я стала больш упэўненай у сабе. У наступным годзе зноў збіраюся змагацца за верхнія прыступкі па рускай мове і геаграфіі.

Да ўсіх прадметаў у школе я стаўлюся практычна аднолькава. Часта бяруць у палон мяне хімія і матэматыка.



**МАКАР ШПАКОЎСКІ:**

- На фізіцы трымаецца навука і наш свет, гэтым яна мне і падабаецца. У будучыні я хачу звязаць сваё жыццё з фізікай, так як фізіка ўсюды. Пры падрыхтоўцы я адкрыў для сябе многа новага і цікавага. Алімпіяда была цяжкая, але я рыхтаваўся і быў гатовы да яе.

Акрамя фізікі, цікаўлюся матэматыкай і гісторыяй. Яны дапамагаюць зразумець тое, што адбываецца ў свеце.

ПРОБА ПЯРА

# УРОКІ ЖЫЦЦЯ

## 1. ШАНУЙЦЕ ЖЫВЁЛ

Гэта адбылося ў халодны восеньскі дзень. Я выйшла на вуліцу, каб пагуляць са сваім сабакам, але раптам пачула, што нехта спачатку жаласна, ціха, а потым ўсё гучней плакаў у кветках. Я падышла і ўбачыла маленькіх безабаронных дваіх кацянят, якія сумна мяўкалі і глядзелі на мяне. Нехта бессардэчны выкінуў іх на вуліцу.

Адно кацяня было маленькае, але вельмі пушыстае, і ў яго быў раскошны доўгі хвост. Знізу яго лапкі былі беленькія, быццам кацяня апранула шкарпэткі. Другое кацяня было не менш прыгожае. Яго погляд быў добры і пранізлівы.

“Што рабіць?” – мільганула думка. Доўга не думаючы, я спыталася дазволу ў таты для таго, каб занесці кацянят у хату. Адразу ж наліла ім цёплага малачка. Кацяняткі ўзрадаваліся і кінуліся да талеркі. Я стаяла і задаволена глядзела на іх. Калі кацяняты паелі, я ўзяла іх на рукі, яны ласкава прытуліліся да мяне. Гэта было так, як быццам яны дзякавалі мне. Калі я пачала іх гладзіць, то стала відавочным, што адно кацяня хворае. Яго вочкі слязіліся. Я прамыла іх чайным настоем.

Раніцай, перад тым, як пайсці ў школу, я наведала маленькіх жывёлак, каб пакарміць іх, і ўбачыла, што цела аднаго з кацянят ляжала нерухома, вочы яго былі закрытыя. Другое ж кацяня не адыходзіла ад яго і ўвесь час сумавала. Яно так і не змагло забыцца на свайго сябра па няшчасці.

Хутка пасля страты, другое кацяня забрала да сябе мая сяброўка Ліза, паколькі ў мяне ўжо жыў свой гадаванец.

Спадзяюся на тое, што людзі, якія пачулі маю гісторыю, ніколі не пакінуць жывёл без гаспадара і заўсёды будуць добра адносіцца да братоў нашых меншых. Хочацца, каб мы з вамі не забываліся, што чалавек у адказе за тых, каго прыручыў.

**Юлія КАЛЯНКОВІЧ.**

*2.* Гэта адбылося ранняй вясной, калі з цёплых краёў да нас вяртаюцца птушкі. Усё навокал ўраз напоўнілася птушынымі спевамі. Прыляцелі шпакі і ў нашу шпакоўню. Засяліліся і пачалі адразу наводзіць парадак у хатцы. Мы спачатку не звярталі на іх увагі, але аднойчы ў двары пачуўся нейкі лямант і птушыны шчэбет. Калі мы выйшлі, то ўбачылі, як два шпакі б’юцца так, ажно пер’е з іх ляціць. Потым адзін з іх адляцеў убок, а двое іншых пачалі гучна спяваць на жэрдачцы.

- Відаць, не хапіла яму кватэры, - пажартаваў тата. – Прыйдзецца і яму зрабіць хатку. А гаспадыню ўжо ён найдзе.

І мы пачалі рабіць шпакоўню. Калі справа была завершана, мы павесілі шпакоўню непадалёку ад першай. Спачатку птушкі не звярталі на яе ўвагі.

- Відаць, не спадабалася ім наша кватэра, - сказаў я тату.

Але аднаго разу раніцай я заўважыў, што на шпакоўні сядзяць дзве птушачкі і весела спяваюць. А праз некалькі дзён яны пачалі ўладкоўваць сабе гняздо ў новай кватэры. Вось так вырашылася жыллёвае пытанне птушак пры дапамозе нашых намаганняў.

І вы таксама пабудуйце кватэру для птушак. Яны вам будуць вельмі ўдзячныя.

**Кірыл РАХМАНАЎ.**

*3.* Гэта гісторыя здарылася гады два таму назад. Андрэй і Коля былі лепшымі сябрамі. Адным сонечным днём хлопцы сустрэліся і вырашылі пагуляць у двары з мячом. Яны паклікалі з суседняга двара хлапчукоў і пачалі гуляць у футбол. Усё было добра. Хлопцам было весела, і яны зусім забыліся пра час.

У працэсе гульні Коля кінуў мяч Андрэйку, якога ў той жа момант паклікала маці. Затрымаць мяч у хлопчыка не атрымалася, і “зброя” гульні, пераляцеўшы плот, трапіла ў акно. Акенца затрашчала, і шкло рассыпалася. Убачыўшы гэта, хлапчукі ў адзін момант разбегліся. Пасярод двара застаўся толькі разгублены Андрэйка.

**(Працяг на стар. 7)**

## СПОРТ

# РУХ - ГЭТА ЖЫЦЦЁ



***У хуткім тэмпе жыцця ў нас нехапае часу на спорт. І гэта вельмі кепска, бо адна з самых галоўных рэчаў – гэта здароўе. Некаторыя вучні нашай школы, нягледзячы на занятасць, клапоцяцца пра сваё здароўе штодзённа. Адным з іх з'яўляецца вучань дзясятага класа нашай школы, Аляксандр Пяхота, які займаецца спартыўным арыентаваннем з дзевяці гадоў.***

**- Аляксандр, ты ўдзяляеш шмат увагі спорту. Чаму ён так неабходны для цябе?**

- Я займаюся спортам таму, што мне гэта падабаецца. Заняткі спортам умацоўваюць здароўе. Акрамя гэтага, добрая фізічная падрыхтоўка не стане перашкодай пры паступленні ў запланаваную ўстанову.

**- Якая спартыўная ўзнагарода з'яўляецца самай значнай для цябе?**

- Залаты кубак, які я атрымаў па выніках удзелу ў конкурсе па спартыўным арыентаванні "Вясенні компас", што праводзіўся на абласным узроўні, а прыняць удзел у ім маглі ўсе жадаючыя, каму было на той час не менш чым 25 год.

**- Хто з'яўляецца тваім спартыўным кумірам?**

– Андрэй Салін – майстар спорту па спартыўным арыентаванні.

**- Чаго ты б хацеў пажадаць пачынаючым спартсменам дадзенага віду спорту?**

- Каб дасягнуць паспяховых вынікаў, трэба сур'ёзна падыходзіць да заняткаў спартыўным арыентаваннем, а таксама больш бегаць.

**Гутарыла Ксенія ГУРЭНЧЫК.**

# УРОКІ ЖЫЦЦЯ

**(Працяг. Пачатак на стар. 6)**

Праз некалькі хвілін з кватэры дома, у акно якой трапіў мяч, выскачыла разгневаная жанчына. Яна пачала крычаць і сароміць Андрэйку, які ўвесь час паўтараў, што зробленае не мае да яго ніякага дачынення. З-за таго, што хлапчук не прызнаваўся, жанчына яшчэ больш сердавала. Хлопцы-ўцекачы стаялі за вуглом і ўсё чулі. Іх пачало мучыць сумленне, і хлапчукі вырашылі прызнацца.

Гэты выпадак гаворыць аб тым, што трэба заўсёды адказваць за свае ўчынкі, трэба быць сумленным перад іншымі людзьмі і перад самім сабою.

**Кацярына АЎТУХОВІЧ.**

## РЭЙТЫНГ ШКОЛЬНЫХ ПРАДМЕТАЎ ВАЧАМІ ВУЧНЯЎ 5-10 КЛАСАЎ (215 ЧАЛАВЕК)

**Фізкультура і здароўе - 73**
**Біялогія - 21**
**Матэматыка - 21**
**Працоўнае навучанне - 19**
**Інфарматыка - 13**
**Англійская мова -12**
**Руская мова - 7**
**Фізіка - 6**
**Хімія - 6**
**Беларуская мова - 5**
**Гісторыя - 5**
**Медыцынская падрыхтоўка - 5**
**Беларуская літаратура - 4**
**Геаграфія - 4**
**Грамадазнаўства - 4**
**Руская літаратура - 4**
**Выяўленчае мастацтва -2**
**Дапрызыўная падрыхтоўка - 3**
**Чарчэнне - 1**

# ШОСТЫ ДЗЕНЬ



## СПАРТЫЎНЫ Я - СПАРТЫЎНАЯ КРАІНА

***Тое, што дапамагае быць мацнейшым, тое, што выпрацоўвае сілу волі - гэта спорт. А што на гэты конт чуваць у нашай установе адукацыі?***

Так, у СШ № 2 восьмага лістапада была праведзена спартландыя, у якой прымалі ўдзел вучні (6-9 класы), настаўнікі і бацькі. Кожны з іх мог прадэманстраваць свае спартыўныя дасягненні. Але, акрамя спартыўных заданняў, арганізатарамі мерапрыемства для выканання былі прапанаваны інтэлектуальныя (назваць як мага больш відаў спорту па акрэсленых крытэрыях) і творчыя заданні (конкурс на самы прыгожы танец). Як бачна, ўдзельнікі спартландыі маглі праявіць сябе ў розных відах дзейнасці. Кожная з каманд білася да канца, кожны верыў у перамогу. І каманда ў складзе настаўнікаў дасягнула жаданага выніку!

Спартыўны я - спартыўная краіна! Вось да чаго трэба імкнуцца чалавецтву. Гэта быў маленькі, але значны наш крок да адзначанай вышэй мэты!

**Алена ЦЭНКЕЛЬ.**






ГУО «Средняя школа № 2 г. Березино»

ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**ДУА «Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно»** 223311, горад Беразіно, вуліца Мультана, 19.
**Эл. пошта: berezinosch2.edu@tut.by**
**Сайт: berezino2.schools.by**
Клуб «Юны журналіст»

**КЛУБ “ЮНЫ ЖУРНАЛІСТ” ЗАПРАШАЕ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА ТВОРЧЫХ, ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ І АКТЫЎНЫХ АСОБ! ДАЛУЧАЙЦЕСЯ, КАЛІ ЛАСКА!**

**ЦЯПЕР У НАС ЁСЦЬ СВАЯ СТАРОНКА Ў ІНТЭРНЭЦЕ**

**VK.COM/CLUB59543714!**

**НЕ БУДЗЬЦЕ ЧУЖЫНЦАМІ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**